Грыцкевіч Н.П.,
дацэнт

## РАЗВІЦЦЁ САМАСТОЙНАСЦІ СТУДЭНТАЎ Ў ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ ЗАМЕЖНАЙ МОВЫ

Сучасны этап развіцця нашага грамадства патрабуе падрыхтоўкі актыўных, творча мыслячых спецыялістаў, якія могуць арыентавацца ў складаных сітуацыях, самастойна знаходзіць новыя спосабы вырашэння прафесійных задач. Таму адной з умоў удасканалення вучэбна-выхаваўчага працэсу ва універсітэце з'яўляецца развіццё самастойнасці студэнтаў як важнай асабістай якасці будучага спецыяліста.

Псіхолага-педагагічныя даследаванні сведчаць аб тым, што ў працэсе самастойнай работы ў адзінстве выступаюць матывацыйны, змястоўна-аперацыйны і валявы кампаненты.

Матывацыйны кампанент самастойнасці характарызуецца станоўчымі адносінамі асобы да дзейнасці, якую яна выконвае, ініцыятыўнасцю, зацікаўленасцю прадметам дзейнасці, імкненнем да яе ажыццяўлення.

Змястоўна-аперацыйны кампанент самастойнасці прадугледжвае валоданне агульнымі навыкамі працы, якія ўключаюць уменні ставіць сабе мэту, планаваць сваю дзейнасць, эфектыўна яе арганізоўваць валоданне рацыянальнымі метадамі і прыёмамі работы, здольнасць ажыццяўляць самакантроль на ўсіх этапах яе выканання. Неабходна асобна вызначыць інтэлектуальныя спосабы пазнання, г.зн. уменне чалавека аперыраваць пэўнымі мысліцельнымі аперацыямі (параўноўваць, аналізаваць, сінтэзаваць, вычляняць істотныя якасці прадметаў, абстрагуючыся ад другарадных, абагульняць, знаходзіць галоўныя сувязі і адносіны паміж з'явамі).

Валявы кампанент самастойнасці праяўляецца ў імкненні і ўменні пераадольваць цяжкасці.

Самастойнасць мае індывідуальны характар. Яна не ўяўляе сабой прыроджаную якасць асобы, таму яе неабходна развіваць. Праблема фарміравання самастойнасці студэнтаў павінна вырашацца з пазіцып тэорыі дзейнасці, якая распрацавана псіхолагамі Б.Г.Ананьевым, Л.С.Выгодскім, А.М.Лявонцьевым, С.Л.Рубінштэйнам і інш. Дзейнасны падыход да вырашэння праблемы фарміравання гэтай маральнай якасці асобы будучага спецыяліста азначае, што дадзены працэс павінен ажыццяўляцца ў актыўнай дзейнасці.

Адным са шляхоў развіцця самастойнасці студэнтаў у працэсе вывучэння замежных моў з'яўляецца выкарыстанне творчых заданняў міжпрадметнага характару, якія стымулююць пазнавальныя і прафесіянальныя інтарэсы студэнтаў.

Выкарыстоўваючы тэрмін «творчае заданне», мы маем на ўвазе заданні, якія дазваляюць кіраваць творчым узроўнем самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў. Калі мы гаворым аб творчасці студэнтаў, то разумеем суб'ектыўную творчасць як «адкрыццё для сябе», таму што атрыманы рэзультат (прадукт) мае суб'ектыўную значнасць.

Характэрнымі асаблівасцямі творчых заданняў міжпрадметнага характару з'яўляюцца наступныя:

- прафесійная накіраванасць іх зместу, улічваючы профіль факультэта і спецыялізацыі студэнтаў;
- улік наяўных ведаў, ранейшага жыццёвага вопыту студэнтаў;
- наяўнасць праблемы, якая патрабуе вырашэння;
- навізна і практычная прафесійная значнасць задання;
- сама фармулёўка задання прадугледжвае ўключэнне студэнта ў канкрэтную пазнавальную дзейнасць пошукавага характару.

Янушкова Т.П.,
дацэнт

## ХАРАКТАРЫСТЫКА ШМАТУЗРОЎНЕВАЙ СІСТЭМЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ Ў КРАІНАХ ЗАХАДУ

Сістэма вышэйшай адукацыі ў краінах Захаду падраздзяляецца на тры ступені.

Першая ступень дае агульную фундаментальную неспецыялізаваную падрыхтоўку. Навучанне на гэтай ступені працягваецца 3-4 гады і завяршаецца прысваеннем ступені бакалаўра. Для атрымання статуса спецыяліста выпускнікам трэба закончыць другую ступень.

Другая ступень навучання працягваецца 1-2 гады, і пасля яе заканчэння прысвойваецца ступень магістра, на гэтай ступені студэнты займаюцца па індывідуальных планах.

Трэцяя ступень прадугледжвае навучанне ў дактарантуры і абарону доктарскай дысертацыі. Вузкая спецыялізацыя пачынаецца менавіта на гэтай ступені. Тэрмін навучання 1-3 гады пасля другой ступені і прыкладна 5 год пасля першай.

У многіх краінах выкарыстоўваецца англа-амерыканская сістэма шматузроўневай адукацыі. Многія універсітэты Захаду самі ўстанаўліваюць назвы кваліфікацыі, назвы ступеняў. Але ёсць краіны, якія прытрымліваюцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ